Беларуская асацыяцыя журналістаў

# НАВОШТА ПРАЦАВАЦЬ І СЯБРАВАЦЬ З НДА?



ГАЙД ДЛЯ МЕДЫЯЎ

2024

# ХТО ТАКІЯ НДА І ЧЫМ ЯНЫ ЗАЙМАЮЦЦА?

## ЯК РАСШЫФРОЎВАЕЦЦА НДА?

Недзяржаўныя арганізацыі (НДА) таксама называюць некамерцыйнымі (НКА) або няўрадавымі (НУА), а разам яны складаюць арганізацыі грамадзянскай супольнасці (АГС).

Калі сцісла, то гэтыя арганізацыі ствараюцца людзьмі для людзей і часцей за ўсё **займаюцца тымі праблемамі і выклікамі, якія не можа вырашыць дзяржава**. Яны не імкнуцца да прыбытку ці ўлады. Іх галоўная фундаментальная мэта — падтрымка людзей, дапамога людзям (групам насельніцтва).

Часам усе гэтыя арганізацыі называюць трэцім сектарам, таму што два іншыя — гэта дзяржава і бізнес. У ідэальным свеце ўсе тры сектары павінны дапаўняць і падтрымліваць адзін аднаго. Менавіта таму ў многіх краінах НДА фінансуюцца з розных крыніц: дзяржава, фонды, падтрымка бізнесу і данаты грамадзян і грамадзянак.

Пры гэтым тэрмін «арганізацыі грамадзянскай супольнасці» аб'ядноўвае ў сабе ўсе вышэйпералічаныя фармулёўкі і формы: асобныя актывісты і актывісткі, нізавыя ініцыятывы, аб'яднанні людзей, установы і зарэгістраваныя арганізацыі, фонды і г.д. Юрыдычная рэгістрацыя значэння не мае — усё гэта АГС.

## ЧЫМ ЗАЙМАЮЦЦА НДА?

Самае важнае, што трэба ведаць: трэці сектар ці АГС — найважнейшы складнік любога дэмакратычнага грамадства. Бо менавіта гэты сектар дапамагае шукаць рашэнні для тых праблем (пытанняў), якія не вырашаюць дзяржава і бізнес.

А нярэдка робіць праблемы ў грамадстве бачнымі, каб дзяржава нарэшце звярнула на іх увагу. Бо гэта яе абавязак. І ў гэтым у НДА і СМІ ёсць падабенства.

Тэмы, з якімі працуюць НДА, могуць быць самымі рознымі — адукацыя і асвета, экадружалюбнасць, праваабарона, грамадзянскі ўдзел і палітыка (у шырокім сэнсе слова), гендэрная роўнасць, здароўе і медыцына, гісторыя і культура і г.д.

Фарматы зноў-такі самыя розныя: маладзёжныя арганізацыі, аб'яднанні людзей для падтрымкі і дапамогі ўразлівым групам (людзям з інваліднасцю, дзецям з аўтызмам, ЛГБТК+ супольнасці і інш.). А яшчэ гэта могуць быць фонды, аб'яднанні аднадумцаў, студэнцкія саюзы і нават суседскія, дваровыя кам'юніці.
Усё гэта аб'яднанні людзей, у якіх супадаюць інтарэсы і якія жадаюць палепшыць не толькі сваё жыццё, але і жыццё іншых, жадаюць пазітыўна ўплываць на змены ў грамадстве.

# ЧЫМ НДА КАРЫСНЫЯ ДЛЯ МЕДЫЯЎ?

А вось гэтая частка самая цікавая. Бо часта НДА валодаюць вялікай колькасцю інфармацыі, доступам да людзей і іх гісторый, а таксама да дадзеных і статыстыкі.

ЦЯПЕР РАЗБЯРОМ УСЁ ПА ПАРАДКУ.

## [1] ЛЮДЗІ І ІХ ГІСТОРЫІ

Паколькі НДА дапамагаюць людзям і падтрымліваюць іх у няпростыя для іх часы, то часцей за ўсё ў арганізацый ёсць кантакты, ёсць рэальныя гісторыі, кейсы. І гэта могуць быць патэнцыйныя героі і гераіні для журналісцкіх расследаванняў, рэпартажаў і інтэрв'ю. Часам для расследавальніцкіх фарматаў гэта адзін з самых каштоўных ключоў.

✳ **Што важна памятаць:** у многіх арганізацый ёсць пратаколы бяспекі, бо жыццё і здароўе людзей для іх у прыярытэце. Таму НДА могуць доўга ўзгадняць удзел у інтэрв'ю, не прадастаўляць прамых кантактаў, прасіць матэрыялы на вычытку, часам адмаўляць СМІ.

## [2] ЭКСКЛЮЗІЎНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ

Кожная арганізацыя, ініцыятыва мае вузкі кірунак, дзе працуюць прафесіяналы і эксперты — а значыць, у той ці іншай тэме яны валодаюць эксклюзіўнай інфармацыяй. Гэта могуць быць закрытыя дадзеныя, якія лягуць у аснову журналісцкага расследавання. Альбо дэталі і нюансы, якімі валодаюць НДА, могуць стаць важнай інфанагодай — бо ёсць праблемы, пра якія пакуль ведаюць толькі яны.

✳ **Што важна памятаць:** асноўная мэта некамерцыйных арганізацый — вырашэнне праблемы, пазітыўныя змены, а значыць, яны могуць наладжваць працоўныя працэсы з дзяржавай або яе інстытуцыямі. Напрыклад, арганізацыі, якія займаюцца тэмамі здароўя, часта супрацоўнічаюць з дактарамі і сістэмай аховы здароўя.

Таму часам НДА могуць адмаўляць у інтэрв'ю ці даваць абмежаваную колькасць інфармацыі, а таксама прасіць матэрыялы і артыкулы на вычытку, быць скрупулёзнымі да фармулёвак. Бо любое няправільна вытлумачанае слова ці публікацыя з памылкай можа прывесці да сур'ёзных наступстваў.

## [3] УНІКАЛЬНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ, СТАТЫСТЫКА, ДАДЗЕНЫЯ

Аснова працы НДА — адказ на патрэбы людзей. Па гэтай прычыне многія арганізацыі і ініцыятывы праводзяць даследаванні, ацэнку патрэбаў, збор статыстыкі. І часам мала ў каго яшчэ ёсць такія дадзеныя, а гэта значыць, што для журналісцкай працы гэта добрая крыніца для фактчэкінгу і пацверджання дакладнасці інфармацыі.

✳ **Што важна памятаць:** многія з даследаванняў і апытанняў могуць не публікавацца, быць адкрытымі часткова — зноў жа з меркаванняў бяспекі. Але калі вы супрацоўнічаеце з НДА, то часта яны дзеляцца дадзенымі і статыстыкай. А таксама гатовы дапамагаць і рабіць праблемы бачнымі (у нас жа ёсць агульныя мэты).

## [4] ТЭРМІНАЛОГІЯ І КАРЭКТНАЯ МОВА

Арганізацыі грамадзянскай супольнасці заўсёды прытрымліваюцца мэт недыскрымінацыі і інклюзіі. Бо любая дыскрымінацыя і гвалт пачынаецца з моўнага ўзроўню — незалежна ад тэматыкі.Таму НДА могуць актыўна дапамагаць рэдакцыям змяншаць узровень мовы варожасці, аказваць дапамогу і кансультацыі па зменах у тэрміналогіі.

Як прыклад, праект «Медыярашальнік» — прадукт напісаны ў супрацоўніцтве з рознымі НДА ў дапамогу журналістам і журналісткам, дзе тлумачыцца, як і якімі словамі карэктна пісаць пра ЛГБТК+, мігрантаў і мігрантак, людзей з інваліднасцю і гэтак далей.

✳ **Што важна:** ёсць кейсы, калі НДА наўпрост пішуць у рэдакцыі СМІ і ўказваюць на іх памылкі. Тут важна памятаць — усё для таго, каб вырашыць праблемы, якія ёсць у грамадстве, а не для таго, каб «прынізіць» медыі. Калі вы сумняваецеся ў тэрміналогіі, звярнуцца да НДА — гэта добрая магчымасць ісці ў нагу з часам і пісаць карэктна.

Беларуская асацыяцыя журналістаў

# ПАДВЯДЗЕМ НЕВЯЛІКІ ВЫНІК

Выбудоўваючы з НДА даверлівыя і ўстойлівыя сувязі, арганізацыі могуць дапамагаць журналістам і журналісткам з героямі і гераінямі, актуальнымі праблемамі і фактамі для журналісцкіх расследаванняў, а таксама статыстыкай, дадзенымі і даследаваннямі для фактчэкінгу.

**Пры гэтым многія мэты і задачы НДА і медыяў супадаюць, таму шмат у чым дапамога і супрацоўніцтва выгадныя для абодвух бакоў.**

2024

Беларуская асацыяцыя журналістаў

# ЯК БУДАВАЦЬ НЕТВОРКІНГ І СУПРАЦОЎНІЦТВА З НДА?

Садзейнічанне і кааперацыя — гэта тое, што робіць моцнымі ўсіх.

ВОСЬ НЕКАЛЬКІ ЛАЙФХАКАЎ, ЯКІЯ ДАПАМОГУЦЬ.

2024

## [1] ДАВЕР І НАДЗЕЙНАСЦЬ

У НДА шмат пратаколаў бяспекі. Найлепш, каб з канкрэтнай арганізацыяй ці арганізацыямі ўстанаўлівалі кантакты канкрэтны журналіст(ка). Тады адносіны могуць стаць больш давернымі і надзейнымі, а значыць, можна будзе хутчэй дагрукацца да НДА і больш шчыльна супрацоўнічаць.

## [2] СУВЯЗЬ І ЎЗАЕМАПАДТРЫМКА

Калі вы хочаце супрацоўнічаць з нейкімі канкрэтнымі НДА, то лепш выбудоўваць нетворкінг. **Што гэта значыць?** Гэта шчырая цікавасць да арганізацыі і яе членаў, выбудоўванне адносін, якія заснаваны на ўзаемнай цікавасці, падтрымцы. **Калі зусім проста** — гэта чалавечы кантакт, а не адносіны «арганізацыя-арганізацыя». Бо чым лепш мы ведаем і разумеем адно аднаго, тым лягчэй нам весці камунікацыю і працей адно аднаму дапамагаць.

## [3] ЗНОСІНЫ МОЖНА ВЕСЦІ НЕ ТОЛЬКІ ПА ПРАЦОЎНЫХ ПЫТАННЯХ

НДА часта ладзяць івенты і праграмы, каб пазнаёміцца з журналістамі і журналісткамі, усталяваць нетворкінг і знайсці прафесійныя кантакты. Зносіны з НДА — гэта магчымасць даведацца пра іх планы, новыя даследаванні або кейсы і апублікаваць матэрыял першымі. Гэта выдатная магчымасць больш падрабязна даведацца аб самой арганізацыі, аб людзях, якія там працуюць. Таму будаваць зносіны, тэлефанаваць і пісаць НДА можна не толькі, каб узяць каментар, але і каб даведацца, якія ў іх планы.

## [4] ПАМЯТАЦЬ ПРА СПЕЦЫФІКУ ПРАЦЫ НДА

Варта заўсёды памятаць пра спецыфіку працы НДА: **іх фундаментальная мэта — бяспека людзей**. Па гэтай прычыне ёсць пратаколы бяспекі, якія ўключаюць праверку каментара ці тэксту перад публікацыяй, а часам адмову ад супрацоўніцтва. Але ўсё гэта толькі прафесійная плоскасць. НДА ніколі не ставяць за мэту нашкодзіць або пакрыўдзіць рэдакцыі або журналістаў і журналістак. Разуменне ўнутранай кухні працы НДА — адказ на многія пытанні, у тым ліку, як працаваць і сябраваць з арганізацыямі грамадзянскай супольнасці.